## Парламенцкія весткі

# Памяць вяртае на паўстагоддзя...

Шмат гадоў нашых школьнікаў вучылі таму, што ў Вялікай Айчыннай вайне мы перамаглі самі, а саюзнікі толькі тое і рабілі, што зацягвалі адкрыццё другога фронту, і толькі потым, адчуўшы моц савецкіх армій, рушылі на дапамогу.



Гэта вельмі прымітыўны і несумленны погляд на гісторыю. Саюзнікі накіравалі нам за гады другой сусветнай вайны 78 канвояў з 1404 марскіх транспартных караблёў. Гэта велізарная дапамога, і яна дорага каштавала. Гітлераўскія авіяцыя і флот бомбамі і тарпедамі атакавалі канвоі — загінулі тысячы маракоў, тысячы тон каштоўных ваенных і гуманітарных грузаў пайшлі на дно марское...

31 жніўня гэтага года спаўняецца 50 гадоў з дня прыбыцця ў Архангельск першага Паўночнага канвою. Шэсць транспартаў у суправаджэнні ваенных караблёў Вялікабрытаніі. Канвой меў кодавую назву «Дэрвіш».

Міжнародны няўрадавы фонд «Вечная памяць салдатам» праводзіць сусветную дабрачынную акцыю «Паўночны канвой «Дэрвіш-91». Акцыя пройдзе па краінах Еўропы як караван прымірэння. Гэта не толькі шанаванне мужнасці змагароў супраць тыраніі, але і высокагуманны акт даравання і памінання тых салдат, якія па прымусу саўдзельнічалі ў агрэсіі. Эскадра савецкіх транспартных і ваенных караблёў наведае парты Гаўр (Францыя), Саутгемптан (Вялікабрытанія), Гамбург (Германія), Осла (Нарвегія), а затым — Мурманск і Архангельск.

На борце караблёў знаходзяцца ветэраны, грамадскія і палітычныя дзеячы, артысты, якія будуць выступаць перад жыхарамі партовых гарадоў. Арганізуецца збор сродкаў для ўшанавання памяці герояў Паўночных канвояў, для аказання дапамогі жывым ветэранам.

Стаць Ганаровымі камандорамі канвою «Дэрвіш-91» далі згоду Прэзідэнт СССР Міхаіл Гарбачоў і прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі Джон Мэйджар. Савецкі камітэт ветэранаў Паўночнага Флоту і Савета апекуноў Міжнароднага няўрадавага фонду «Вечная памяць салдатам» папрасіў таксама Старшыню Вярхоўнага Савета БССР Мікалая Дземянцея даць згоду заняць пасаду Ганаровага камандора акцыі «Паўночны канвой «Дэрвіш-91».

Чым будуць займацца Ганаровыя камандоры? Абавязкі няскладаныя, але пачэсныя: яны запрашаюцца 31 жніўня ў Архангельск на ўрачыстасці. Там будзе адкрыты мемарыял удзельнікам паўночных паходаў, сярод якіх англічане, амерыканцы, аўстралійцы, канадцы, рускія, шатландцы... Ці былі сярод іх беларусы, пакуль невядома, але Мікалай Дземянцей ад імя беларускага народа ўшануе памяць тых, хто дапамагаў нам у цяжкі час харчамі, медыкаментамі, адзеннем, зброяй.

Учора прэзідэнт фонду «Вечная памяць салдатам» ветэран другой сусветнай вайны Анатоль Бязуглаў уручыў Старшыні Вярхоўнага Савета БССР Мікалаю Дземянцею дыплом Ганаровага камандора «Паўночнага канвою «Дэрвіш-91».

**Андрэй НІКОЛЬСКІ.**
**Фота Міхася ЖЫЛІНСКАГА.**

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ